# Каб кніга стала бліжэй да чытача

- 22.11.2024 16:31
- Культура

**У Цэнтральнай дзіцячай бібліятэцы імя М. Астроўскага, якая святкуе векавы юбілей, абмеркавалі ролю кніжнай скарбніцы ў выхаванні чалавека як асобы. Высокі статус мерапрыемству надаў удзел у ім дырэктара Цэнтралізаванай сістэмы дзіцячых бібліятэк Таццяны Швед і старшыні Мінскага гарадскога аддзялення СПБ Міхаіла Пазнякова. Яны расказалі пра важнасць чытання і ролю прыгожага пісьменства ў грамадстве, звярнуўшы ўвагу на супрацоўніцтва бібліятэкараў і літаратараў.**

Галоўны бібліёграф Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Вольга Палунчанка шчыра падзякавала бібліятэкарам за іх працу, пажадала творчага натхнення і падзялілася вопытам, як яе праект, прысвечаны 80-годдзю вызвалення краіны, знайшоў водклік у школах і стаў сапраўды запатрабаваным. Так, улічваючы ўзрост навучэнцаў, пра подзвіг абаронцаў Брэскай крэпасці распавядалася праз паэтычнае слова. Вольга Палунчанка расказала пра важнасць праграмы «Прафесар» і шэраг праектаў, сярод якіх вылучаецца «Быць вартым Вялікай Перамогі». Яна таксама анансавала Рэспубліканскую дзіцячую навукова-практычную канферэнцыю «Застацца чалавекам у полымі вайны» (адбудзецца 6 мая 2025 года ў Мінску з удзелам навучэнцаў з Расійскай Федэрацыі) і выказала прапанову перавыдаць кнігі. прысвечаныя піянерам-героям.



Дырэктар Слуцкай раённай цэнтральнай бібліятэкі Людміла Гурыновіч раказала, што робіцца, каб аматары кніг з ахвотай наведвалі яе ўстанову. Сапраўды, паказчыкі выдатныя: звыш 22 тысяч чытачоў, 127 тысяч наведванняў у год, больш за 1,5 тысячы мерапрыемстваў, звыш 91 тысячы экземпляраў кніг выдаецца ў бібліятэцы. Амаль 80% кніг за 10 сёлетніх месяцаў набыта ў выдавецтваў, у тым ліку ВД «Звязда».

Наколькі важна ездзіць ва ўсе куткі краіны, каб беларуская кніга стала бліжэй да чытача, нагадала Святлана Ганцарэвіч, намеснік дырэктара ВД «Звязда»: «Гэта не вельмі проста, але патрэбна, таму столькі ўвагі і сродкаў (у тым ліку маральных) удзяляецца арганізацыі і правядзенню шматлікіх прэзентацый кніг ва ўстановах адукацыі і бібліятэках, удзелу ў розных літаратурных фестывалях. Вядома, ВД „Звязда“ будзе працягваць гэту карпатлівую працу надалей! У рэгіёнах чытачы не настолькі „разбэшчаны“ жывымі сустрэчамі з літаратарамі з аўтограф-сесіяй». Прысутныя прадстаўнікі бібліятэк з рэгіёнаў выказалі вялікую падзяку СПБ і ВД «Звязда» за тое, што яны сумесна заўжды знаходзяць магчымасць прывесці пісьменнікаў нават у глыбінку.

Вядучы рэдактар выдавецтва «Мастацкая літаратура» Аксана Малішэўская-Спрынчан расказала пра кнігі-навінкі. Галоўны рэдактар часопіса «Бярозка» Яніна Каралёва падзялілася вопытам павелічэння тыража выдання і наладжвання стасункаў з чытачом праз сацсеткі. Яна падзякавала старшыні СПБ, дырэктару ВД «Звязда» Алесю Карлюкевічу за падтрымку беларускамоўнага кантэнта на партале.

**Ірына ПРЫМАК**

**Фота аўтара**